**ФОРУМ**

# КАРНАВАЛ У ГОРАДЗЕ



Чацвёрты Мінскі форум вулічных тэатраў адбудзецца з 6 па 8 мая.

На тэрыторыі Верхняга горада выступяць артысты з Беларусі, Германіі, Польшчы, Прыднястроўя, Расіі. Дырэктар Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў Наталля Шаранговіч называе гэты форум, дарэчы, пакуль адзіны падобнага профілю ў нашай краіне, сустрэчай чалавека і свята, чалавека і мастацтва, чалавека і гульні, горада і новых ідэй у ім. Бо гарадская прастора напаўняецца фарбамі, эмоцыямі, весялосцю, узаемадзеяннем. Няма сцэны паміж гледачамі і артыстамі, паміж горадам і яго жыхарамі. Вулічныя артысты абуджаюць у людзях лепшыя праявы жыцця — смех, радасць, спагадлівасць, жаданне дапамагчы адзін аднаму, пагуляць разам. Форум — гэта свята, куды могуць прыйсці абсалютна ўсе.

На працягу трох дзён гледачы ўбачаць больш за 20 розных імпрэз — інтэрактыўныя спектаклі, харэаграфічныя пастаноўкі, клаўнаду, нумары на хадулях.

Наша вулічнае мастацтва прадставяць тэатры з Мінска, Віцебска, Жлобіна. Адкрые праграму фестывалю эксперыментальны тэатр Eye, заснаваны 15 гадоў таму студэнтамі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Увечары 6 мая на плошчы Свабоды адбудзецца паказ спектакля «Рабінзанада» паводле твораў Дантэ, Даніэля Дэфо і Мішэля Турньe. Традыцыйнае карнавальнае шэсце пачнецца 7 мая ў 12.00, затым праграму другога дня форуму працягне Беларускі дзяржаўны цырк. Завершыць фестываль народны маладзёжны тэатр «Кола» з Віцебска.



У Мінск зноў прыедуць удзельнікі творчай суполкі «Карнавальчык» з Санкт-Пецярбурга, якіх называюць талісманам форуму. Збіраецца ў дарогу тэатр «Тук-тук!» з Цiраспаля. З Вроцлава чакаюць «Тэатр на чамаданах». Упершыню на форум прыбудуць госці з Германіі — прадстаўнікі Dulce Compania з Берліна з хадульным прадстаўленнем «Каралева сэрцаў».

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

АФІША